**Н.А. Поляк**

# ДЫСІДЭНЦКАЕ ПЫТАННЕ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВКЛ У 2-Й ПАЛОВЕ XVII – XVIII СТСТ.

## ДИССИДЕНТСКИЙ ВОПРОС НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ ВКЛ ВО 2-Й ПОЛОВИНЕ XVII – XVIII ВВ.

## DISSIDENT ISSUE ON THE BELARUSIAN LANDS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 2ND HALF OF THE 17TH – 18TH CENTURIES

Складаная канфесійная сітуацыя на землях Беларусі ВКЛ у 2-й палове XVII – XVIII стст. прывяла да фарміравання праблемы рэлігійнага дысідэнства. Абмежаванне ў правах праваслаўных і пратэстантаў выклікала занепакоенасць адзінаверных суседніх дзяржаў і садзейнічала іх умешванню ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай.

Ключавыя словы: праваслаўныя, пратэстанты, рэлігійныя і грамадзянскія правы, міжнародныя адносіны, міжканфесійныя адносіны, рэлігійнае дысідэнства.

A complex confessional situation on the lands of Belarus the Grand Duchy of Lithuania the second half of the 17th – 18th centuries led to the formation of the problem of religious dissidence. The restriction of the rights of Orthodox and Protestants caused concern among the faithful of neighboring countries and served as an excuse for interference in the internal political affairs of the Polish-Lithuanian Commonwealth.

Keywords: orthodox, protestants, religious and civil rights, international relationships, interfaith relations, religious dissidence.

УО «Военная академия Республики Беларусь», Минск, Беларусь.

Беларускія землі ў гісторыі міжнародных адносін Рэчы Паспалітай у канцы XVII – XVIII стст. заўжды ўзгадваюцца даследчыкамі мімаходзь. Аднак менавіта канфесійная сітуацыя гэтага рэгіёна стала адной з лёсавызначальных у перакройванні палітычнай карты Еўропы ў канцы XVIII ст.

У другой палове XVII–XVIII стст. тэрыторыя Беларусі была месцам суіснавання і ўзаемадзеяння чатырох адгалінаванняў хрысціянства, колькасныя і якасныя суадносіны паміж якімі былі спецыфічнымі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Рэчы Паспалітай. Гэта абумовіла своеасаблівасць канфесійнай сітуацыі і лакалізацыю дысідэнцкага пытання менавіта тут.

Праваслаўныя вернікі беларускіх зямель канцэнтраваліся ў асноўным у Беларускай (Магілёўскай) епархіі з кафедрай у Магілёве і часткова – вакол Луцкай, Пярэмышльскай і мітрапалічай епархій. Пасля далучэння ў канцы XVII ст. Луцкай, Пярэмышльскай і Львоўсквай епархій да ўніі асноўная маса праваслаўнага насельніцтва Рэчы Паспалітай знаходзілася ў асноўным у беларускіх ваяводствах ВКЛ. Прыходы Магілёўскай епархіі разам з манастырамі і цэрквамі мітрапалічай епархіі, якія размяшчаліся ў Вільні, Беластоку, Смаленску, Слуцку, Мінску, Пінску, Драгічыне і іншых гарадах, утваралі сабою магутны праваслаўны рэгіён Рэчы Паспалітай.

Пратэстанцкае насельніцтва Беларусі было прадстаўлена кальвіністамі і, у меншай ступені, лютэранамі. Кальвіністы (рэфармаваныя евангелікі) Рэчы Паспалітай уваходзілі ў склад Вялікапольскай, Малапольскай і Літоўскай абшчын (правінцый). Беларускія кальвіністы колькасна пераважалі ў Літоўскай евангеліцка-рэфармаванай правінцыі, якая ў XVIII ст. лічылася найбольш моцнай, буйнай і трывалай у параўнанні з дзвюма астатнімі. Літоўская правінцыя падзялялася на 6 дыстрыктаў (акруг), чатыры з якіх (Віленскі, Беларускі (Рускі), Навагрудскі і Берасцейскі (Падляшскі)) прыходзіліся на беларускія землі.

Каталіцкі касцёл ахапіў беларускія землі некалькімі біскупствамі. Шчыльнасць каталіцкіх парафій на беларускіх землях, у параўнанні з заходнімі тэрыторыямі Рэчы Паспалітай, была невысокай, што абумовіла спецыфіку развіцця тут рэлігійнага дысідэнцтва. Уніяцкая царква Беларусі ў пачатку XVIII ст. была прадстаўлена пяццю епархіямі. На працягу XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі назіралася тэндэнцыя росту колькасці ўніяцкіх прыходаў.

У Беларусі ў сувязі з контррэфармацыяй і распачатай пракаталіцкай дзяржаўнай палітыкай, заняпадам моцных некаталіцкіх (праваслаўных і пратэстанцкіх) асяродкаў, а так сама шматлікімі войнамі, усталявалася канфесійнае супрацьстаянне паміж каталікамі і ўніятамі з аднаго боку і праваслаўнымі з пратэстантамі з іншага. Прававая дыскрымінацыя некатолікаў прывяла да афармлення дысідэнцкага пытання. Такая сітуацыя спраўакавала ўмешванне ва ўнутраныя справы Кароны замежных краін – Расіі, Прусіі, Швецыі, Ватыкана і інш. Выкарыстоўваючы прыгнечаны стан аднаверных канфесій (пратэстантаў Прусія, праваслаўных Расія) суседнія дзяржавы ўцягвалі Рэч Паспалітую і землі Беларусі ў міжнародныя канфлікты і дыпламатычнае супрацьстаянне.

Забарона будаваць і аднаўляць храмы, адпраўляць публічныя богаслужэнні, арганізоўваць культурна-асветніцкую і місіянерскую дзейнасць, а так сама прадстаўляць свае інтарэсы ў дзяржаўным і мясцовых органах улады, весці неабмежаваную эканамічна-гаспадарчую працу было рэальнасцю тагачаснага жыцця дысідэнтаў.

Падтрымка сваіх аднаверных з боку суседняй Расійскай дзяржавы, Прусіі, Швецыі праяўлялася ў выглядзе перадачы фінансавых сродкаў, накіроўвання сваіх паўнамоцных для мадэрацыі спрэчных сітуацый у міжканфесійных адносінах, пратэжыраванне і ўладкоўванне на вольныя святарскія пасады сваіх прадстаўнікоў і інш. Такая дапамога ўмацоўвала залежнасць дысідэнтаў ад замежных апекуноў і давала апошнім падставы лабіраваць свае інтарэсы.

Такое неадназначнае пытанне як дысідэнцкае неаднойчы абмяркоўвалася ў гістарыяграфіі, але роля спецыфічных канфесійных адносін на землях Беларусі не разглядалася. Неабходна звярнуць увагу на сканцэнтраванасць праваслаўнага насельніцтва Рэчы Паспалітай пераважна на этнічнай тэрыторыі Беларусі, дзе захавалася апошняя ў Рэчы Паспалітай праваслаўная епархія і дзейнічалі буйныя праваслаўныя духоўныя асяродкі ў Вільні, Драгічыне, Слуцку, Смаленску і інш. На беларускіх і літоўскіх землях самастойна і актыўна працавала самая моцная, шматлікая і трывалая ў Рэчы Паспалітай кальвінісцкая абшчына. Таму можна з упэўненасцю казаць аб істотным значэнні беларускага дысідэнцкага пытання ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай і ВКЛ у 2-й палове XVII – XVIII стст.